Край, дзе я жыву
Сумесны праект газеты «Звязда» і РГА «Белая Русь»

«СЯРОД НАЙЛЕПШЫХ ЕЎРАПЕЙСКІХ ГРАВЁРАЎ...»

У пачатку XVII стагоддзя ў афармленні кніг ксілаграфію ўсё часцей змяняе медзярыт — гравюра на метале (пераважна на медзі). Гэты жанр на доўгі час становіцца вядучым у мастацтве, і менавіта з ім звязаны найлепшыя дасягненні тагачаснай графікі. Самым умелым, дасканалым сярод майстроў медзярыту быў наш славуты зямляк Аляксандр Тарасевіч. Яго творы не саступалі работам найлепшых заходнееўрапейскіх гравёраў. Больш за тое, па аднадушным сцвярджэнні яго тагачасных калег, ён пераўзыходзіў многіх мастакоў Усходняй Еўропы, куды яго запрашалі папрацаваць.

Студзень (з кнігі «Разарыум»).

Пра жыццё Тарасевіча вядома не так ужо і многа. Дата нараджэння згубілася дзесьці ў XVI стагоддзі, хоць даследчыкі схільны лічыць такою 1640 год. Сваю непарыўную сувязь з родным краем гравёр падкрэсліваў і ў подпісах пад медзярытамі. Першую пра сябе звестку змяшчае на тытуле кнігі «Разарыум», дзе напісана па-лацінску: «Аляксандр Тарасевіч гравіраваў года 1672 у Глуску». Вось і вынікае, што тут і праходзіў ранні перыяд яго творчасці, хоць пазней стаў адмысловым умельцам.

Ён быў надзвычай адораны, рознабаковы, прафесійна сталы майстар, які бездакорна рабіў малюнкі, валодаў рэдкім пачуццём кампазіцыі, вышкаленай тэхнікай гравіроўкі, вялікай творчай фантазіяй... Гравёр працаваў у асноўным у галіне мастацкага аздаблення кнігі і ў станковай графіцы. Значныя дасягненні запісаў на свой рахунак і ў жанры партрэта. І ўсё ж, калі меркаваць па творчай спадчыне, больш за ўсё любіў працаваць па медзі і праслыў вядомым еўрапейскім гравёрам.

Паездзіць і пабачыць давялося нямала, аднак глыбокімі каранямі заўсёды быў звязаны з роднай Беларуссю. Больш за тое, няцяжка заўважыць, што назіранні за працоўнымі буднямі беларусаў адбіліся ў многіх яго работах. Сорак ілюстрацый кнігі «Разарыум» па задуме, стылі і выкананні відавочна дзеляцца на дзве групы: каляндарны цыкл і гравюры на евангельскія сюжэты. Гравюры першага цыкла адлюстроўваюць у асноўным сялянскую працу ва ўсе месяцы года. У іх відаць тонкасць назіранняў, уважлівае вока мастака і сіла рэалізму. Творы сведчаць, што ў працы Тарасевіч шырока карыстаўся натурай, рэаліямі навакольнага жыцця. Жывучы ў Глуску, мастак меў магчымасць непасрэдна назіраць за жыццём сялян, а значыць, перадаваць яго затым з глыбокім веданнем народнага побыту, фальклору, адзення... З вялікім майстэрствам адлюстраваны беларускія краявіды. І, як сведчаць подпісы, большасць з іх зроблены ў Глуску.

Над сваім першым вялікім цыклам мастак працаваў каля пяці гадоў — з 1762-га, калі ім быў выкананы тытул кнігі, і да 1677-га, даты выхаду кнігі «Разарыум» у свет. Гэта, бадай, яго найлепшая і найбольш вядомая работа ў кніжнай графіцы, якая прынесла аўтару славу.

Гравёр найярчэй праявіў сябе як мастак кнігі, аднак шмат працаваў і як партрэтыст. Сярод ранніх партрэтаў і тыя, што выкананыя ў Глуску. У прыватнасці, партрэт М. Сапунскага (1677) і многія іншыя работы. Высокім майстэрствам малюнка і гравіроўкі вылучаецца выкананы ў 1675 годзе ў Глуску медзярыт «Радаслоўнае дрэва А. Палубінскага» (маршалак Аляксандр-Гілярый Палубінскі быў мецэнатам мастака).

У 1680-я гады Тарасевіч пераехаў з Глуска ў Вільню, дзе супрацоўнічаў з друкарняй Віленскай езуіцкай акадэміі. Каля 1688 года майстар пакінуў Беларусь і Літву, асталяваўся ў Кіева-Пячэрскай лаўры, дзе прыняў манаства пад імем Антоній.

Працы мастака з Глуска яскрава сведчаць, што ён меў бліскучую мастацкую адукацыю, але дзе вучыўся — невядома. Ёсць меркаванні, што адукацыю мастак набыў у Аўгсбургу (Баварыя), дзе вучыўся ў славутых Кіліянаў, бо паводле графічнай манеры яго творы блізкія да гэтай школы.

Выдатная адукацыя ў адным з цэнтраў тагачаснай еўрапейскай культуры назаўсёды вызваліла мастака ад царкоўна-кананічных схем і канонаў, спрыяла свецкаму рэалістычнаму падыходу да ілюстравання навакольнага жыцця. У асабістай бібліятэцы А. Тарасевіча, якую мастак, відавочна, перавёз у Кіеў з Беларусі (пасля яго смерці бібліятэка перайшла ва ўласнасць Кіева-Пячэрскай лаўры), сярод шматлікіх альбомаў і атласаў, гравюр з відамі архітэктурных ансамбляў Рыма, Мадрыда, Парыжа, Неапаля, ілюстраванай Бібліі, дапаможнікаў па навучанні рысунку былі творы замежных майстроў, пераважна галандскіх і нямецкіх.

Працы Аляксандра Тарасевіча сведчаць, што менавіта ён узняў беларускую гравюру да найлепшых узораў еўрапейскага мастацтва. Яго творы былі вядомы і ў Заходняй Еўропе. Лічыцца, што наш зямляк стварыў адметную школу гравюр і што яго працы для паслядоўнікаў засталіся недасяжнымі. Доўгі час яго творы ўпрыгожвалі касцёл манахаў-бернардзінцаў у Глуску, які ў 1935 годзе перастаў выконваць свае функцыі, а яго багацце было знішчана і расцягана. Назаўсёды зніклі і гравюры Тарасевіча.

Дабравешчанне (з кнігі «Разарыум»).

Закончыў свой жыццёвы шлях Тарасевіч ігуменам Кіева-Пячэрскай лаўры. Па архіўных дакументах устаноўлена дата яго смерці — паміж 12 ліпеня і 15 жніўня 1727 года.

Існуе і такі факт, што ў гады жыцця Аляксандра Тарасевіча вядомым майстрам медзярыту праявіў сябе і Лявонцій Тарасевіч, якога схільны лічыць родным братам Аляксандра. Ён таксама быў буйным гравёрам Усходняй Еўропы, творы якога можна паставіць на адзін узровень з найлепшымі еўрапейскімі гравюрамі. У жыццёвай і творчай біяграфіі майстроў шмат агульнага, пра што сведчаць шматлікія даследаванні. І калі крыху пафантазіраваць, дык можна ўявіць, што ў нас быў не адзін, а два славутыя мастакі-гравёры.

Валерый ВАСІЛЕЎСКІ,
г/п Глуск, Магілёўская вобл.

ШТО ТАКОЕ КАТРУШНІЦКІ ЛЕМЕЗЕНЬ?

Дрыбінскі гісторыка-этнаграфічны музей рыхтуецца стаць адзіным у краіне, дзе можна будзе пабачыць увесь гістарычны працэс унікальнага рамяства.

Урачыстае адкрыццё адноўленага музея адбудзецца ўжо ў наступным месяцы. Пасля рэканструкцыі ён значна памяняе свой твар. Дагэтуль тут усяго было па трошкі, і толькі адна зала прысвячалася шапавальству. Але для промыслу, які прызнаны нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю Беларусі, гэта вельмі мала, палічылі тут, і вырашылі больш дэталёва паказаць усё, чым ганарыцца раён. Стварыць умовы для захавання самабытнага духу старадаўняга рамяства дапамагла дзяржпраграма «Культура Беларусі». Ужо зроблены мантаж драўляных канструкцый і поўным ходам ідзе напаўненне памяшканняў экспанатамі.

— У адным з іх мы вырашылі ўзнавіць побыт сялянскай шапавальскай сям'і, дзе можна будзе прасачыць этапы апрацоўкі воўны, паглядзець, як жылі шапавалы, у што апраналіся, — расказвае **дырэктар музея Жанна КЛІМАВА.** — Другая зала распавядзе пра тое, як развіваецца промысел сёння і што такое катрушніцкі лемезень. Трэцяя — наглядна прадэманструе наш кірмашовы гандаль. Выдумляць нічога не прыйдзецца, бо наш фестываль народнай творчасці, народных промыслаў і рамёстваў «Дрыбінскія таржкі» працягвае былыя традыцыі. У нашым музеі таксама можна будзе пабачыць вырабы сучасных майстроў, рэчы, зробленыя рукамі выхаванцаў узорнага дзіцячага аматарскага аб'яднання «Катрушнік». А каб сваіх герояў кожны ведаў у твар, адкрыем так званую дошку гонару, дзе размесцім фота майстроў.

— Такога музея вы дакладна нідзе не пабачыце, — запэўнівае **намеснік старшыні Дрыбінскага райвыканкама Дзмітрый ПІМАШЭНКА.** — Менавіта ў нашым раёне ўзнік катрушніцкі лемезень, які захаваўся па сёння разам з традыцыямі старадаўняй шапавальскай школы. Для нас гэта гонар і адметнасць Дрыбінскага раёна. Прыемна, што мы ўяўляем цікавасць нават за межамі краіны. Навукоўцы з Расіі прыязджалі да нас для больш дэталёвых даследаванняў. І таксама былі ўражаны.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

ЗНАЙСЦІ САЛДАТА... ПРАЗ БІБЛІЯТЭКУ

Сёння шмат хто цікавіцца лёсам сваіх загінуўшых на вайне бацькоў і дзядоў. І падказаць шлях гэтых пошукаў могуць не толькі ў архівах, але і ў бібліятэцы. Галоўная з іх у Магілёўскай вобласці, якая носіць імя Леніна, сёлета адзначае свой 80-гадовы юбілей. Тут захоўваюцца кнігі, якія чыталі салдаты перад боем. А яшчэ шмат рэдкіх дакументаў з розных архіваў.

Падчас дзён адчыненых дзвярэй тут зноў нагадвалі пра гады ліхалецця і знаёмілі чытачоў з навінкамі. Дзякуючы краязнаўцу з Варонежа Рыгору Плахатнюку нядаўна тут з'явіліся 12 нумароў расійскага часопіса «Военно-исторический архив» з апошнімі даследаваннямі гісторыкаў пра невядомыя старонкі вайны, яе герояў, фотадакументы, якія распаўсюджваюцца на шырокую аўдыторыю ўпершыню.

— З Рыгорам Плахатнюком нас звязвае агульнае мінулае, — адзначыла падчас прэзентацыі часопіса **загадчыца аддзела беларускай і краязнаўчай літаратуры Тамара КАЛІНІНА.** — Яго дзед змагаўся на Буйніцкім полі ў палку Сямёна Кцепава, у апошні дзень абароны трапіў у палон і быў вызвалены толькі 2 мая 1945 года. Плахатнюк узгадвае, што дзед не любіў хадзіць на звязаныя з вайной урачыстасці. У той час усе, хто прайшоў праз палон, адчувалі сябе без віны вінаватымі. І ўнук даў сабе зарок, калі вырасце, абавязкова пабывае на Буйніцкім полі, паглядзіць, дзе ваяваў дзед, і будзе рабіць усё для таго, каб ніхто з апаленых вайной не быў забыты.

Супрацоўніцтва з бібліятэкай пачалося з 2011 года, калі Рыгор Плахатнюк выйшаў на сайт установы і быў уражаны віртуальнай выставай «Абарона Магілёва. Хроніка мужнасці». У тым жа годзе ён упершыню прыехаў у Магілёў, наведаў Буйніцкае поле. А бібліятэцы ён перадаў шмат унікальных дакументаў — копіі картачак ваеннапалонных з нямецкіх і расійскіх архіваў.

Каштоўнасць апошняга яго падарунка ўжо ацанілі гісторыкі і краязнаўцы. «Часопіс унікальны тым, што заснаваны на дакументах, якія знаходзяцца ў Цэнтральным архіве Мінабароны Расіі ў Падольску, — адзначыў **выкладчык Магілёўскага ўніверсітэта харчавання Фёдар СВІНЦІЦКІ, аўтар некалькіх кніг пра вайну.** — У тым архіве ўсе дакументы Вялікай Айчыннай вайны. Але беларусам цяжкавата туды трапіць, як і іншаземцам, нам патрэбен спецыяльны дазвол Мінабароны Расіі. Лёс многіх салдат па 1941 годзе мы не можам прасачыць — не захавалася дакументаў. А вось па 1944 годзе ўсе дакументы ёсць. Яны ляжаць у Падольску і чакаюць свайго даследчыка. Я толькі па магілёўскай наступальнай аперацыі знайшоў 970 новых прозвішчаў, і многія з іх з'явіліся на помніках. У Магілёўскім раёне ёсць маленькая вёска Вялікае Бушкава. Там загінулі 102 салдаты. У 2009 годзе там паставілі помнік».

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by